# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!_**

**_№ 6 (44) ЛЮТЫ 2018_**

_Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці_

## ПЕРАМОГА ПАВІННА БЫЦЬ ЗА ЛЕПШЫМІ!






Падрабязнасці чытайце на 2-й і 3-й старонках



Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 44, люты 2018 г.

## ПРАФЕСІЯ МАРЫ



*…Я в школе получила, как ни странно,*
*Что-то дороже, больше, чем диплом.*
*Мечта сбылась. У меня нет предлога*
*Роптать на жизнь. Я счастлива вдвойне:*
*Профессий есть на свете очень много,*
*Но лучшая из них досталась мне.*

**Пасля прачытання прыведзеных радкоў з верша настаўніцы замежнай мовы Вікторыі Уладзіміраўны Ламбоцкай, становіцца зразумела, што абраная прафесія прыносіць ёй сапраўднае шчасце, якім педагог заўсёды гатова падзяліцца са сваімі вучнямі.**

Быць настаўнікам – гэта мастацтва, праца не менш творчая, чым праца пісьменніка ці кампазітара, але больш цяжкая і адказная. Бо настаўнік звяртаецца да душы не праз музыку, не з дапамогай фарбаў, а напрамую. Настаўнік выхоўвае нас сваім уласным прыкладам, сваімі ведамі, сваёй любоўю...

Так і Вікторыя Уладзіміраўна, якая любіць і паважае сваіх вучняў, накіроўвае іх на правільны шлях і шчыра верыць у шчаслівую зорку сваіх выхаванцаў. Яшчэ адным пацвярджэннем прафесіяналізму і нязгаснага жадання педагога служыць на карысць людзям з'яўляецца тое, што В.У. Ламбоцкая стала лаўрэатам творчага конкурсу "Педагагічны старт-2017" і была ўзнагароджана дыпломам Упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама і Мінскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

**- Вікторыя Уладзіміраўна, раскажыце, калі ласка, пра свой шлях у прафесію.**

– Першае месца працы знайшла тут, у СШ № 2. Трапіла ў Беразіно па размеркаванні і затрымалася на чатыры гады. Маё ж дзяцінства і школьныя гады прайшлі ў Чэрвеньскім раёне. Будучы вучаніцай, я старанна выконвала заданні па ўсіх прадметах, але больш за ўсё падабаліся мне заняткі па беларускай і рускай літаратуры і, зразумела, замежнай мове. Пасля заканчэння школы сумненняў наконт выбару прафесіі не ўзнікала, таму стала студэнткай педагагічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Тым больш, што добрым прыкладам для мяне стала матуля, якая ў свой час скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага і па сённяшні дзень выкладае гісторыю ў адной са школ Чэрвеньскага раёна, у якой, дарэчы, вучылася і я.

**- Зразумела, што складаная праца настаўніка патрабуе шмат сіл і часу. Але, напэўна, знаходзіцца вольная хвіліна і для хобі?**

- Яшчэ са школьных гадоў займаюся вершаскладаннем. Пішу пра тое, што адчуваю. Лічу, што дакрануцца да сэрца чытача, можна толькі шчырасцю і дабрынёй.

**- Які Ваш жыццёвы дэвіз?**

- Жыць сёння, але і не забывацца пра заўтрашні дзень. Ніколі не апускаць рукі пры няўдачах. Старацца зрабіць дзень лепшым не толькі для сябе, але і для іншых.

**Паліна СЯМАШКА**

*Дом, у якім утульна ўсім!*
berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 44, люты 2018 г.*




***9 лютага Прэзідэнт РБ Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка паведаміў, што 2018 год у Беларусі вырашана абвясціць Годам малой радзімы. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што на прыняцце такога важнага рашэння падахвоцілі разважанні аб важнасці малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. «Яна шматаблічная. Для адных гэта родны горад, вуліца ў горадзе або невялікі дворык, вёска, дзе прайшлі лепшыя дзіцячыя гады, для іншых — кавалачак дзікай прыроды, які цешыў вока і дарыў пачуццё напоўненасці і спакою. А для тых, хто з'ехаў шукаць шчасця ў іншыя краіны, малой радзімай стала Беларусь», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.***

***Прэзідэнт падкрэсліў, што прыйшоў час кожнаму не толькі ўзгадаць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалку зямлі. «Вельмі хочацца, каб дапамога ішла ад сэрца, стала ўласнай ініцыятывай. Яна можа быць матэрыяльнай, стваральнай, асветніцкай, творчай — хто як можа і хто колькі можа. Залежыць ад магчымасцяў, фантазіі і жадання кожнага. Надышоў момант праявіць сябе і ўпісаць сваё імя ў гісторыю гэтай малой радзімы, гэтага кавалачка нашай зямлі», — заявіў ён.***

## Ведай, вывучай і паважай правілы дарожнага руху!!!



23 лютага 2018 года на базе Мар'інагорскай гімназіі прайшла XIII Алімпіяда па Правілах дарожнага руху сярод вучняў устаноў адукацыі Мінскай вобласці.

Алімпіяда, якая стала штогадовым традыцыйным мерапрыемствам, сабрала лепшых знаўцаў правілаў з 22 раёнаў Міншчыны і горада Жодзіна. Абласная алімпіяда складалася з некалькіх этапаў: творчы конкурс «Дзеці Мінскай вобласці – за дарогі без аварый!», індывідуальнае рашэнне білетаў, каманднае рашэнне задачы «Дарожная сітуацыя».


УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ МИНСКОГО ОБЛАСТНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА
XIII ОЛИМПИАДА ПО ПРАВИЛАМ ДОРОЖНОГО ДВИЖЕНИЯ
ДИПЛОМ
I СТЕПЕНИ
НАГРАЖДАЕТСЯ КОМАНДА
Березинского района
Начальник управления Г.Н. Казак

Па выніках конкурсных выпрабаванняў пераможцам алімпіяды 2018 года стала каманда Бярэзінскага раёна, якая складаецца з навучэнцаў ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно": ***Бандзік Павел*** (5"А" кл.), ***Цэдрык Станіслаў*** ( 7"Б" кл.), ***Старавойтаў Ілья*** (6"Б" кл.).




***23 лютага адзначаецца Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У гэтым годзе свята мае асаблівае значэнне - Узброеным Сілам Беларусі спаўняецца 100 гадоў. Дата 23 лютага 1918 года лічыцца днём нараджэння Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, якая абараніла і захавала наш народ у складаную эпоху пачатку XX ст.***

Сучасная беларуская армія вядзе адлік сваёй гісторыі ад Мінскай ваеннай акругі, якая за гады існавання шмат разоў мяняла назву. Але як бы яна ні называлася, якія б тэрыторыі ні ўключала ў сябе, яна, створана ў вельмі цяжкі для краіны перыяд – гады грамадзянскай вайны. І з першых гадоў свайго існавання стала адыгрываць вядучую ролю ў справе ўмацавання абароннай моцы Савецкай дзяржавы.





Са стварэннем у 1992 годзе суверэннай незалежнай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь – на базе Беларускай ваеннай акругі былі створаны Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь.

Сёння Узброеныя Сілы Беларусі складаюць аснову ваеннай арганізацыі дзяржавы, прызначаны для забеспячэння ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці.







# Акцыя “Сябруем з Законам!”





Дзелавая гульня “Мы жывём па законе”



Прэс-канферэнцыя “Падлетак і закон”



Бярэзінскі РАУС. Дзень адкрытых дзвярэй



Бацькоўскі сход «Атмасфера жыцця сям'і як фактар фізічнага, духоўнага і псіхічнага здароўя дзіцяці»



Мерапрыемства “Спяшайся пакінуць у жыцці добры адбітак”



# 14 ЦІКАВЫХ ФАКТАЎ ПРА 14 ЛЮТАГА




*1. У Старажытным Рыме 14 лютага адзначалася свята ў гонар багіні шлюбу і мацярынства Юноны.* У гэты дзень дзяўчаты пісалі любоўныя лісты, якія потым кідалі ў вялізную скрыню. Юнакі павінны былі, не гледзячы, выцягнуць адзін ліст і пачаць даглядаць за той дзяўчынай, чый ліст ім трапіўся.

*2. На наступны дзень, 15 лютага, адзначалася свята багацця — Луперкалій, прысвечанае богу Фавну.* Гэты дзень маладыя людзі прысвячалі пошуку спадарожніка жыцця. І некаторым гэта цалкам ўдавалася, так як пасля свята часта з'яўлялася шмат новых сем'яў.

*3. Прыкладна ў гэта ж час здзяйсняліся рытуальныя гульні ў гонар бога Пана.*

4. У Сярэднія стагоддзя лічылі, што ў другі тыдзень лютага птушкі ўтвараюць шлюбныя пары. Адсюль *другая назва Дня святога Валянціна — «Птушынае вяселле».*

5. Праз некаторы час пасля смерці *Валянцін быў кананізаваны каталіцкай царквой*, а ў 496 годзе *рымскі папа Геласіус абвясціў 14 лютага днём святога Валянціна.*

6. У Еўропе ў масавым парадку Дзень святога Валянціна сталі адзначаць толькі ў 13 стагоддзі, у ЗША — у 1777 годзе і ў Расіі — толькі на рубяжы 20 і 21 стагоддзяў.

*7. Святы Валянцін – каталік, а ў праваслаўных ёсць і свае заступнікі – Святыя Пётр і Фяўронія. 8 ліпеня праваслаўныя хрысціяне адзначаюць "Дзень закаханых"*, Руская Праваслаўная Царква шануе святых Пятра і Фяўронню, якія заступаюцца за маладых і асабліва за маладыя сем'і.

*8. Адной з першых валянцінак* была картка, пасланая *ў 1415 годзе* Чарльзам, герцагам Арлеанскім, сваёй жонцы з турмы Тауэр, дзе ён быў у зняволенні. *Картка да гэтага часу захоўваецца ў Брытанскім музеі.*

*9. У 1797 годзе ў Англіі было выдадзена «Кіраўніцтва для маладога чалавека па напісанні валянцінак».*

10. Яшчэ прыдворны летапісец англійскага двара. С. Пепіс, які жыў у 17 стагоддзі, пісаў, што 14 лютага закаханыя абменьваліся сувенірамі.

*11. Цынамона (карыца) адвеку стагоддзяў была тайным пасланнем закаханых.* Пачалося ўсё з змрачнаватай гісторыі імператара Нерона, які, дарэчы, жыў задоўга да нараджэння святога Валянціна. Ён зарэзаў сваю палову кінжалам. Усвядоміўшы зробленае і раскаяўшыся, ён загадаў спаліць на яе пахаванні гадавы запас карыцы (у той час вострыя прыправы шанаваліся вышэй за золата).

*12. Арыгінальны спосаб прызнацца ў каханні — падарыць сваёй пасіі звычайны... памідор.* Калісьці даўно ў Францыі яго называлі яблыкам кахання.

*13. Канапа Л'амур — гэта шырокае крэсла, якое месціць парачку закаханых.*

*14. Раней сярод некаторых сям'яў таксама карысталася попытам канапа ў форме лацінскай літары S.* У гэтым выпадку закаханыя маглі сядзець побач — але не занадта блізка!

# Зімовыя забавы












*Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 44, люты 2018 г.***

# За любімую Беларусь!

*У лютым адной з традыцый моладзі з'яўляецца віншаванне з днём усіх закаханых. У гэты дзень прынята дарыць падарункі і ўвагу сваім каханым людзям, выказваць цёплыя словы і добрыя пажаданні сябрам, калегам. У рамках усебеларускай акцыі ГА БРСМ "За любімую Беларусь!" валанцёры нашай школы павіншавалі са святам 14 лютага ветэранаў ВАВ Стасевіч С.П. і Ф.С. Блізнюка, начальніка Бярэзінскага аддзела адукацыі, спорту і турызму Жукоўскую Н.А., дырэктара ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно" Абрамовіч С.В. Валанцёры дарылі сэрцы, на якіх былі напісаны добрыя словы і пажаданні.*










ДУА "Сярэдняя школа № 2
горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна, Маркоўская Лізавета, Усачова Валерыя